**ЛІТАРАТУРА**

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 149. Воп. 2. Спр. 1737.
2. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1076. Арк. 105.
3. О правилах для производства и продажи зажигательных спичек: сенатский указ 29.12.1848 г. по высочайшему повелению // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2. (далей – ПСЗ-2). – Т. 23-2. – № 22875. – С. 146.
4. О разрешении повсеместной выделки и продажи зажигательных фосфорных спичек: высочайше утвержденное 7.12.1859 г. мнение Государственного Совета, распубликованное 30.12.1859 г. // ПСЗ-2. – Т. 34-2. – № 35217. – С. 327-328.

УДК [94(476)+314.72 (476) (091)] “18”

# ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ПЕРАСЯЛЕННЯ ДЗЯРЖАЎНЫХ СЯЛЯН І ШЛЯХТЫ НА КАЗЁННЫЯ ЗЕМЛІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ. (АРГАНІЗАЦЫЙНА-ФІНАНСАВЫЯ АСПЕКТЫ)

**Ерашэвіч А. У.**
УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

У прыгонніцкую эпоху перамяшчэнне розных катэгорый паўсвабоднага пераважна сельскага насельніцтва (казённых сялянаў, шляхты, аднадворцаў, вольных людзей, панцырных баяр і інш.) з беларускіх губерняў на пастаяннае месца жыхарства для засялення пустуючых зямель у маланаселеных ускраінных рэгіёнах Расійскай імперыі практыкавалася ў сувязі з стварэннем ваенных пасяленняў, пакараннем удзельнікаў антыўрадавых выступленняў, асабліва пасля падаўлення паўстання 1830-1831 гг. Асноўны паток нелегальнай, стыхійнай, без афіцыйнага дазволу ўраду міграцыі з губерняў Беларусі быў звязаны з пераходамі з аднаго месца ў іншае збеглых прыгонных, салдат, яўрэяў і інш. Аднак царскія ўлады спрабавалі ажыццяўляць і дзяржаўнае рэгуляванне тэрытарыяльнай мабільнасці падаткаабавязанага насельніцтва.

З мэтай развіцця рамёстваў і промыслаў у беларускія губерні прыцягваліся замежныя каланісты з Вюртэмберга, Галандыі і інш. месцаў, для развіцця прамысловасці і гандлю ў гарадах – купцы з вялікарасійскіх губерняў, для стварэння сацыяльнай апоры расійскай улады ў краі была зроблена спроба перасялення казённых сялянаў з цэнтральных расійскіх губерняў. У той жа час афіцыйныя ўлады рабілі неаднаразовыя захады па перамяшчэнні яўрэйскага насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі, а пасля перапаўнення апошніх

іўдзеямі спрабавалі прыцягнуць яўрэяў да заняткаў сельскагаспадарчай працай альбо ў межах беларускіх губерняў ці ў аддаленых ўскраінах Расійскай імперыі. Усім новым пасяленцам даваліся, як правіла, падатковыя палегкі ва ўзносе агульнадзяржаўных падаткаў і збораў.

Дзякуючы ўмяшанню ўрада вядомы выпадак па рассяленні беспакойнай шляхты ў Магілёўскай губерні. Паводле ўказа ад 7.09.1806 г. дзяржава за 24500 руб. выкупіла ў памешчыка Магілёўскага павета Корсака 97 валок зямлі для пасялення на ёй шляхты з земляў надворнага саветніка Яншына, набыла за 2500 руб. размешчаныя на ёй сялянскія дамы, прызначыла 5000 руб. у пазыку для ўладкавання шляхты. Новым пасяленцам давалі 3-гадовыя падатковыя льготы, а пасля сканчэння гэтага тэрміну шляхта абкладалася пазямельным аброкам. Грошы памерам у 7500 руб., выдзеленыя ўладамі на пакупку дамоў і ўладкаванне шляхты, лічыліся казенным доўгам, які пасля 3-х льготных год належыла спаганяць роўнымі часткамі на працягу наступных 10 год, а пасля яго сканчэння выплаты меркавалі падвоіць. У канцы 1807 г. і ў пачатку 1808 г. на новых землях было паселена 68, а ў 1810 г. – 7 шляхецкіх сем'яў, якія павінны былі плаціць у казну на працягу 10 год з валокі зямлі аброк (па 8 руб. з няўдобіцы, а лепшай – па 10 руб., а з 1824 г. – адпаведна па 10 і 13 руб.) [2]. У 1816 г. шляхта, паселеная на купленай урадам зямлі ў Магілёўскім павеце, прасіла адтэрмінаваць ёй узнос 2707,77 руб. нядоімкі, вылучаную пазыку для пакупкі дамоў (у 1811 г. – 274,57 руб., у 1812-1814 гг. – па 616,9 руб.), 582,5 руб. пазямельных. Паводле зацверджанага імператарам Аляксандрам І 18.03.1816 г. журнала Камітэта Міністраў з прычыны беднасці шляхты, недахопу зямлі і спусташэння пасля мінулай вайны было прадпісана к 1816 г. дараваць ёй 1963,66 руб. нядоімкі [1]. Паводле даных акладной кнігі за 1834 г., у Магілёўскім павеце лічылася 159 шляхціцаў мужчын на казённай зямлі, абкладзеных дзяржаўнымі падаткамі і зборамі.

Практычна засталіся на паперы і не прынеслі пажаданых вынікаў распрацаваныя ўрадам меры па перасяленню на беларускія і літоўскія землі казённых сялянаў з вялікарасійскіх губерняў. Паводле праекта 1834 г. дзяржаўным рускім сялянам з унутраных малазямельных губерняў, якія выказалі б жаданне перасяліцца ў заходні край, гарантавалі шэраг льготаў: забяспечыць 8 дзесяцінамі зямлі на адну рэвізскую душу мужчынскага полу, вызваліць на 5 год ад плацяжу казённых падаткаў і грашовых павіннасцей і інш. Рускім сялянам-перасяленцам абяцалі дараваць нядоімкі дзяржаўных падаткаў, асігнаваць казённыя грошы па 100 руб. на кожны двор. У 1836 г. быў вызначаны свабодны зямельны фонд для пераезду вялікарускіх



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

дзяржаўных сялян: разам 77262 дзесяцін зямлі для 9651 душы [3]. Але Міністэрства фінансаў хутка высветліла, што ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях было разам толькі 2894 дзесяцін зусім свабоднай зямлі, якой хапала для размяшчэння 360 душ мужчынскага полу казённых сялян па ўказанай зямельнай норме. Пасля разгляду жадаючых перасяліцца ў заходнія губерні Міністэрства фінансаў дазволіла пераехаць туды толькі 180 дзяржаўным сялянам мужчынам, хоць да 1837 г. на пераезд у Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні з Арлоўскай, Курскай, Пскоўскай пагадзіўся 591 селянін [4]. У Віленскай губерні было адведзена 10 незаселеных маёнткаў з прызначэннем туды з Пскоўскай губерні для пасялення на пастаяннае месца жыхарства 89 рэвізскіх душ казённых сялянаў, у Мінскай – 6 староставаў з накіраваннем туды з той жа Пскоўскай губерні 77 акладных душ, у Беластоцкай вобласці – 1 маёнтак для пераезду туды 14 сялянаў з Курскай губерні. У канцы жніўня 1836 г. для пасялення ў Віленскай губерні з Пскоўскай прыбыла 70 душ казённых сялян мужчын, у Мінскую – 44, астатнія пераехалі на новае месца жыхарства з вясны 1837 г. Праваслаўныя рускія сяляне сяліліся раздробленымі групамі паміж іншаверцамі каталікамі ў невялікія, памерам ад 3 да 33 душ, паселішчы карэннага насельніцтва [3].

Такім чынам, з-за недахопу свабоднай казённай зямлі і іншых розных меркаванняў урад значна паменшыў колькасць патэнцыяльных рускіх пасяленцаў у заходнія губерні з ліку дзяржаўных сялянаў вялікарасійскіх губерняў і аграрная каланізацыя краю правалілася.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 28. Арк. 2, 4, 7, 8 адв.

2. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 89. Арк. 261–262, 264.

3. Пушкаревич, К. А. Преобразование духа народности (эпизод из истории русификации Белоруссии) / К. А. Пушкаревич // Известия Академии наук СССР. Отделение общественных наук. – 1932. – № 1. – С. 15-32.

4. Чепко, В. В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. / В. В. Чепко. – Минск: Наука и техника, 1972. – 268 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ